УДК 947.6(075.8)
ББК 63.3 (4Беи)я73
У68

Друкуецца па рашэнні рэдакцыйна-выдавецкага савета БДПУ,
рэкамендавана секцыяй гуманітарных навук
(пратакол № 11 ад 26.05.05 г.)

*Рэцэнзенты:*
доктар гістарычных навук, прафесар, намеснік дырэктара Інстытута гісторыі НАН Беларусі *У. І. Навіцкі;*
доктар гістарычных навук, прафесар, загадчык кафедры гісторыі старажытных цывілізацый і сярэдневякоўя БДПУ *У. В. Тугай*

*Складальнікі:*
доктар гістарычных навук, прафесар, загадчык кафедры славянскай гісторыі і метадалогіі гістарычнай навукі БДПУ *А. П. Жытко;*
доктар гістарычных навук, прафесар, дэкан гістарычнага факультэта БДПУ *М. М. Забаўскі;*
кандыдат гістарычных навук, дацэнт кафедры славянскай гісторыі і метадалогіі гістарычнай навукі БДПУ *У. С. Пуцік;*
кандыдат гістарычных навук, дацэнт кафедры гісторыі Беларусі БДПУ *А. Ф. Рацько;*
доктар гістарычных навук, прафесар кафедры славянскай гісторыі і метадалогіі гістарычнай навукі БДПУ *В. М. Фамін*

*Пад агульнай рэдакцыяй* А. П. Жытко

**Гісторыя** Беларусі перыяду капіталізму : вучэб. дапам. У 5 ч. Ч. 1.
У68 Урадавая сацыяльная палітыка ў аграрным сектары эканомікі / склад. А. П. Жытко [і інш.]; пад агул. рэд А. П. Жытко. – Мн. : БДПУ, 2005. – 138 с.
ISBN-985-501-098-1.

У дапаможніку асвятляюцца найбольш важныя праблемы сацыяльна-аграрнай палітыкі царскага ўрада ў дачыненні да сялянства і памешчыкаў Беларусі на этапе капіталізму.

Адрасаваны студэнтам гістарычнага факультэта БДПУ, можа быць выкарыстаны навукоўцамі і выкладчыкамі вышэйшых навучальных устаноў.

**УДК 947.6(075.8)**
**ББК 63.3 (4Беи)я73**

**ISBN 985-501-098-1** (ч. 1)
**ISBN 985-501-083-3**

© Жытко, А. П. [і інш.], складанне, 2005
© БДПУ, 2005

Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь

*Установа адукацыі*
«Беларускі дзяржаўны педагагічны універсітэт імя Максіма Танка»

# ГІСТОРЫЯ БЕЛАРУСІ ПЕРЫЯДУ КАПІТАЛІЗМУ

**Вучэбны дапаможнік**

**У пяці частках**

***Частка 1***

## *Урадавая сацыяльная палітыка ў аграрным сектары эканомікі*

уч 3115
Бібліятэка БДПУ імя М. Танка

Мінск 2005

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

# ГЛАВА II. Распрацоўка ўрадавых праграм вырашэння аграрнага пытання (канец XIX – пачатак XX ст.)

Рэформы 1860-х гг., захаваўшыя ў асноўным традыцыйнае абшчыннае ўладкаванне сялян, прынеслі, аднак, і шмат новага. Яны пераўтварылі некалі нефармальную самадзеючую арганізацыю з інстытута звычайнага права ў інстытут дзяржаўнага права, далі ёй статус сялянскай саслоўнай карпарацыі з правам юрыдычнай асобы, рэгламентавалі яе жыццядзейнасць юрыдычна і паставілі пад кантроль адміністрацыі. Аднак рэформы не вырашылі сялянскага пытання ва ўсім аб'ёме. Хадайніцтвы аб самых розных зменах у сялянскім уладкаванні неаднаразова ўздымаліся і на земскіх сходах, і грамадскасцю.

У 80-х гг. XIX ст. змяняецца вектар сацыяльнай палітыкі самадзяржаўя. Уяўленне пра тое, што задачай дзяржавы з'яўляецца клопат аб сялянах, асабліва замацавалася ў час царавання Аляксандра III. Тэндэнцыя, што адлюстравалася ў законах 1861 г. (даць сялянам грамадзянскія свабоды і пераўтварыць дадзеную ім зямлю ў сапраўдную прыватную ўласнасць), усё болей адступала на задні план. Зямля, дадзеная сялянам, з кожным годам усе больш паслядоўна разглядалася як асобны фонд, які існуе дзеля таго, каб забяспечыць існаванне сялян як земляробаў.

У перыяд праўлення Аляксандра III выдаецца шэраг важных законаў, што ўвасобілі ў сябе новыя тэндэнцыі, якія развівалі асобы саслоўны лад. Сярод гэтых актаў неабходна адзначыць наступныя:

- закон ад 18 мая 1886, які абмяжоўваў сялянскія сямейныя надзелы;
- закон ад 12 ліпеня 1889 г., па якому стваралася пасада земскіх начальнікаў і значна пашыраліся паўнамоцтвы валасных судоў;
- закон ад 8 чэрвеня 1893 г., які абмяжоўваў зямельныя перадзелы: забараняў прыватныя перадзелы абшчыннай зямлі і ўсталёўваў мінімальны інтэрвал паміж агульнымі перадзеламі, які раўняўся 12 гадам;
- закон ад 14 снежня 1893 г. ускладняў усялякі продаж зямельных надзелаў, нават калі ён праводзіўся праз абшчыны, а таксама рабіў цалкам немагчымым выхад з абшчыны, скасоўваючы артыкул 165 «Палажэння аб выкупе». Згодна з гэтым законам, і пасля выплаты цалкам выкупной пазыкі пакідаліся ў сіле абмежаванні правоў селяніна распараджацца сваёй зямлёй.

Пералічаныя заканадаўчыя акты, прасякнутыя імкненнем замацаваць адасобленасць сялян, утрымаць іх у стане непаўнавартасных грамадзян, падначаленых дзеянню асобых парадкаў кіравання, асуджалі вёску на застой і нерухомасць.



У гэтых умовах спробы заканатворчай дзейнасці, асноўным матывам якіх было жаданне спыніць усё больш блізкі крызіс у сельскай гаспадарцы, не прыносілі жаданых вынікаў. Збядненне значнай часткі сялянства працягвалася, што канстатавала памылковасць погляду на прычыны гэтай з'явы і неадэкватнасць сродкаў барацьбы з імі. Далей ісці шляхам узмацнення апекі над сялянамі не мела сэнсу.

**Асобыя губернскія нарады Міністэрства ўнутраных спраў па перагляду законаў аб сялянах (1894–1895 гг.).** Пасля адмены прыгоннага права сялянскае пытанне ўпершыню ў поўным аб'еме паўстала ва ўрадавых колах у 90-я гг. Большасць агульнага схода Дзяржаўнага савета, што адбыўся ў [illegible] 1893 г., канстатавала пра недасканаласць заканадаўства аб сялянах і неабходнасць агульнага яго перагляду. Хутка ў 1894 г. Міністэрства ўнутраных спраў (МУС) прапануе на абмеркаванне Асобых губернскіх нарад праграму перагляду ўзаконенняў аб сялянах.

Для выяўлення пазіцый мясцовых дзяржаўных і грамадскіх дзеячаў чыноўнікамі Міністэрства былі падрыхтаваны 66 пытанняў па аграрнай справе ў імперыі. Міністэрства ўнутраных спраў ставіла мэтай «атрымаць [illegible] звесткі і меркаванні начальнікаў губерняў аб частых прабелах у практыцы падпарадкаваных ім установаў, звязаных з ужываннем Палажэнняў 19 лютага 1861 г., а таксама заключэнні аб мерах, прыняцце якіх прызнаецца пажаданым дзеля выпраўлення гэтых хібаў».

Цыркулярная прапанова МУС прадпісвала ўтварыць на месцах Асобыя нарады пад кіраўніцтвам губернатараў і пры абавязковым удзеле губернскіх прадвадзіцеляў дваранства з прыцягненнем прадстаўнікоў мясцовай грамадскасці па выбары губернатараў. Сюды ўвайшлі і павятовыя прадвадзіцелі дваранства, абавязковыя члены губернскіх установаў па сялянскіх справах, земскія начальнікі ці адпаведныя ім службовыя асобы сялянскага кіравання, а таксама іншыя асобы другасных установаў, якія мелі дачыненне да гэтай справы.

Патрабавалася «ўсебакова і непрадузята ацаніць усе даныя практыкі», якія ёсць у распараджэнні Асобых нарад. Прапанавалася разгледзець і даць меркаванні «па прадметах, не закранутых у суправаджальным пераліку, але якія мелі істотнае мясцовае значэнне». Заключэнні і даныя прац нарад прадпісвалася накіраваць у МУС не пазней 1 мая 1895 г.

Так пачалі працаваць Асобыя нарады пад кіраўніцтвам губернатараў пры Міністэрстве ўнутраных спраў. Адказы, якія былі падрыхтаваныя нарадамі, глыбока прапрацоўваліся. Заключэнні губернскіх нарад указвалі на наяўнасць глыбокага крызісу ў аграрнай сферы ў краіне, дзе 80 % насельніцтва пражывала ў вёсцы.



РЭПАЗІТОРЫЙ БДПУ